Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар
УА “Беларускі дзяржаўны
ўніверсітэт культуры
і мастацтваў”
_____________ Ю.П. Бондар
“___”__________ 2011 г.
Рэгістрацыйны № ВД-____/вуч.

# ПРАГРАМА ВУЧЭБНАЙ І ВЫТВОРЧАЙ ПРАКТЫКІ СТУДЭНТАЎ

*па спецыяльнасці 1-17 01 05 Рэжысура свят (па напрамках)
напрамку спецыяльнасці 1-17 01 05-01 Рэжысура свят
(народныя)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск 2011

**Складальнікі:**

*П.А. Гуд,* загадчык кафедры рэжысуры абрадаў і свят установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат гістарычных навук, прафесар;

*В.Л. Гуцько,* старшы выкладчык кафедры рэжысуры абрадаў і свят установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат культуралогіі;

*І.А. Малахава,* загадчык кафедры псіхалогіі і педагогікі ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат педагагічных навук, дацэнт

**Рэцэнзенты:**

*П.Р. Ігнатовіч,* прафесар кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат гістарычных навук, прафесар;

*У.А. Мішчанчук,* дэкан факультэта тэатральнага мастацтва ўстановы адукацыі “Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў”, прафесар, заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Рэкамендавана да зацвярджэння:**

*кафедрай* рэжысуры абрадаў і свят установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 11 ад 28.05.2010 г.);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 3 ад 14.12.2010 г.)

Адказны за рэдакцыю *В.В. Каташвілі*
Адказны за выпуск *В.Л. Гуцько*

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Сучаснае развіццё адукацыйнай сістэмы вышэйшай школы першай ступені, якая забяспечвае падрыхтоўку кампетэнтных і кваліфікаваных спецыялістаў, патрабуе ад выпускнікоў кафедры рэжысуры абрадаў і свят хуткай адаптацыі на новым рабочым месцы пасля дзяржаўнага размеркавання. Гэта немагчыма без выдатнага валодання спецыяльнымі ўменнямі і навыкамі па арганізацыі і правядзенні святочных мерапрыемстаў, відовішчаў, абрадаў, гульнёвых праграм, работы з дзецьмі па развіцці іх выканальніцкіх здольнасцей. Студэнты набываюць патрэбныя веды, уменні і навыкі не толькі ва ўмовах навучання фундаментальным і спецыяльным дысцыплінам, але і падчас непасрэднага ўдзелу ў падрыхтоўцы і правядзенні культурна-масавых мерапрыемстваў раённага, гарадскога, рэспубліканскага ці міжнароднага ўзроўняў, заняткаў з дзецьмі ў творчых калектывах устаноў культуры ці ўстаноў адукацыі ў галіне культуры. Пералічаныя фактары садзейнічаюць таксама больш блізкаму знаёмству з колам пасад і службовых абавязкаў работнікаў устаноў культуры і ўстаноў адукацыі ў галіне культуры, дзе студэнты праходзяць скразную практыку. Такім чынам, вучэбны працэс працякае на новым, практычным узроўні.

Арганізацыя скразной практыкі па спецыяльнасці “Рэжысура свят (народныя)” на факультэце традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў сёння адбываецца па новым адукацыйным стандарце ОСРБ 1-17 01 05-2008. Змест скразной практыкі ўзгоднены з Палажэннем аб парадку арганізацыі, правядзення, падвядзення вынікаў і матэрыяльнага забеспячэння практыкі студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь ад 03.06.2010 № 860.

Дадзеная скразная праграма акрэслівае змест практыкі для другога, трэцяга, чацвёртага і пятага курсаў навучання; уключае бібліяграфічны спіс, які дапаможа ў пошуку звестак аб праблемным полі ўзнятых пытанняў, і метадычныя рэкамендацыі датычна азнаямленчай, рэжысёрскай і пераддыпломнай практыкі і планы выканання практычных заданняў па педагагічнай практыцы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Праграма вызначае мэты і задачы практыкі, змест арганізацыі і кіраўніцтва практыкай, абавязкі студэнтаў-практыкантаў, парадак падвядзення вынікаў. Распрацавана па асноўных раздзелах, у межах якіх прапанаваны агульныя кірункі азнаямлення, сістэматызацыі і паглыблення навыкаў, уменняў і ведаў студэнтаў у галіне сучасных тэхналогій падрыхтоўкі і правядзення свят, арганізацыі педагагічнага працэсу датычна спецдысцыплін ва ўстановах культуры і ўстановах адукацыі ў галіне культуры.

Скразная практыка студэнтаў з'яўляецца абавязковай і адной з галоўных частак падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў у галіне рэжысуры свят.

*Мэта* скразной практыкі – замацаванне ведаў, атрыманых у працэсе навучання ва ўніверсітэце, і авалоданне ўменнямі і навыкамі рэжысёра свят.

Асноўныя *задачы* скразной практыкі:

– пашырыць, паглыбіць набытыя веды ў галіне рэжысуры свят;

– выпрацаваць асноўныя навыкі работы рэжысёра-пастаноўшчыка ў вытворчых умовах устаноў культуры ці ўстаноў адукацыі ў галіне культуры;

– адаптаваць студэнта да калектыўнага супрацоўніцтва ў складзе пастановачнай групы;

– сфарміраваць навыкі педагагічнай дзейнасці ў галіне спецыяльных мастацкіх дысцыплін (асновы рэжысуры і майстэрства акцёра, рэжысура свята, асновы драматургіі, моўнае дзеянне ў свяце, пластычнае рашэнне свята, беларускія народныя гульні, рэжысура традыцыйнага абраду, музычна-шумавое рашэнне свята, мастацка-дэкаратыўнае рашэнне свята і інш.);

– падрыхтаваць студэнта да работы ў сферы святочнай культуры Беларусі.

На працягу скразной практыкі студэнты набываюць вопыт творчай, арганізацыйнай і педагагічнай работы, авалодваюць сучаснымі тэхналогіямі і методыкамі ў галіне рэжысуры свят.

*Базы* практыкі – установы культуры ці ўстановы адукацыі ў галіне культуры.

*Змест* практыкі вызначаецца для кожнага курса спецыяльнасці "Рэжысура свят (народныя)" і прадугледжвае:

– змест і тэрміны выканання групавых і індывідуальных заданняў;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– удзел студэнтаў у мастацка-творчай дзейнасці выбранай базы практыкі;

– прыкладны план і тэрміны правядзення практыкі ў канкрэтных базавых установах;

– парадак падрыхтоўкі і тэрмін абароны студэнтамі справаздач па практыцы;

– пералік баз практык.

Студэнты вывучаюць:

– сучасныя тэхналогіі і методыкі арганізацыі і правядзення абрадаў, відовішчаў, свят ва ўстановах культуры і ўстановах адукацыі ў галіне культуры;

– творчую работу разнастайных устаноў культуры і ўстаноў адукацыі ў галіне культуры;

– перадавы вопыт работы высокакваліфікаваных спецыялістаў у галіне рэжысуры абрадаў і свят;

– вынікі даследаванняў у галіне зместу рэпертуару фальклорных калектываў і вывучэння фальклорнай спадчыны беларусаў і іншых народаў, якія жывуць у Рэспубліцы Беларусь;

– рэжысёрскае бачанне, драматургію, мізансцэніраванне, моўнае рашэнне, музычна-шумавое рашэнне, выкарыстанне формаў актывізацыі гледачоў у сучасных пастаноўках тэатралізаваных канцэртаў і відовішчаў, што арганізоўваюцца і праводзяцца спецыялістамі ўстаноў культуры і ўстаноў адукацыі ў галіне культуры;

– тэхналогіі арганізацыі педагагічнага працэсу ва ўстановах адукацыі ў галіне культуры: этнашколах, сярэдніх школах, гімназіях, каледжах мастацтваў і інш.

*Арганізацыя кіраўніцтва практыкай.* За два месяцы да пачатку вытворчай практыкі яе кіраўнік карэкціруе базы практыкі ў вучэбным аддзеле ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”. Пры неабходнасці прапануе заключыць дагаворы з новымі базамі.

Прадстаўнікі прафесарска-выкладчыцкага складу кафедры рэжысуры абрадаў і свят, якім даручана вядзенне практыкі, ажыццяўляюць размеркаванне студэнтаў па базах практыкі. Асноўныя нарматывы нагрузкі па кіраўніцтве практыкай вызначаюцца загадам рэктара Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

Вучэбна-метадычнае забеспячэнне практыкі здзяйсняюць кіраўнікі практыкі ад кафедры рэжысуры абрадаў і свят, якія

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

забяспечваюць выкананне праграм практыкі і якасць яе правядзення.

*Абавязкі кафедры рэжысуры абрадаў і свят:*

– распрацаваць праграмы практыкі згодна з замацаванай спецыяльнасцю і зацвердзіць іх;

– прызначыць кіраўнікоў практыкі і адказнага за практыку на кафедры;

– рыхтаваць прапановы аб размеркаванні студэнтаў на практыку па базавых арганізацыях; аб зацвярджэнні баз практыкі;

– размеркаваць студэнтаў-практыкантаў паміж кіраўнікамі практыкі ад кафедры;

– ажыццяўляць кантроль за праходжаннем практыкі;

– разглядаць і зацвярджаць справаздачы кіраўнікоў практыкі;

– забяспечваць кіраўнікоў практыкі і студэнтаў неабходнымі метадычнымі распрацоўкамі, праграмамі і формамі справаздачнасці.

*Абавязкі кіраўнікоў практыкі ад кафедры рэжысуры абрадаў і свят:*

– праводзіць арганізацыйныя мерапрыемствы са студэнтамі перад пачаткам практыкі;

– знаёміць з праграмай базы практыкі;

– складаць індывідуальны графік праходжання практыкі кожным студэнтам (сумесна з кіраўніком ад базы практыкі);

– забяспечваць адпаведнасць практыкі яе праграмам;

– здзяйсняць кантроль за вядзеннем дзённікаў студэнтамі-практыкантамі;

– разглядаць справаздачы студэнтаў і рыхтаваць пісьмовую справаздачу па выніках практыкі з прапановамі па яе ўдасканаленні;

– выстаўляць адзнаку ў заліковыя кніжкі і залікова-экзаменацыйную ведамасць пасля падвядзення вынікаў практыкі.

*Абавязкі студэнта-практыканта:*

– скласці графік праходжання практыкі;

– весці дзённік, дзе неабходна адлюстраваць выкананне плана праходжання практыкі;

– дакладна выконваць запланаваныя заданні, запісваць змест і вынікі работы за кожны дзень практыкі;

– падпарадкоўвацца правілам унутранага распарадку базы практыкі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– актыўна ўдзельнічаць у жыцці калектыву базы практыкі, яго творчай рабоце.

*Падвядзенне вынікаў практыкі.* Па заканчэнні практыкі студэнт падае пісьмовую справаздачу і здае кіраўніку практыкі дзённік. Справаздача павінна ўтрымліваць звесткі аб выкананай рабоце за перыяд практыкі.

Студэнт абараняе справаздачу перад прызначаным кіраўніком практыкі ад кафедры і атрымлівае дыферэнцыраваную адзнаку, якая выстаўляецца ў залікова-экзаменацыйную ведамасць і заліковую кніжку кіраўніком практыкі.

Вынікі вытворчай практыкі, найбольш цікавыя прапановы і меркаванні выносяцца для абмеркавання на студэнцкую навуковую канферэнцыю.

Студэнт, які не выканаў праграму практыкі і атрымаў нездавальняльную адзнаку або быў хворы падчас праходжання практыкі, праходзіць яе паўторна ў перыяд студэнцкіх канікул або пасля заняткаў (па дамоўленасці з базай практыкі), а кіраўнікі практыкі атрымліваюць адпаведную нагрузку з разліку: адна гадзіна ў тыдзень на студэнта.

Агульная справаздача кіраўніка практыкі ад кафедры зацвярджаецца на пасяджэнні кафедры. На працягу тыдня пасля пасяджэння кафедры падаецца выпіска з пратакола пасяджэння кафедры кіраўніку практыкі ад універсітэта, а дэкану факультэта традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва – справаздача па выніках практыкі; справаздача абмяркоўваецца на савеце факультэта.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАЙ (АЗНАЯМЛЕНЧАЙ) ПРАКТЫКІ

Вучэбная (азнаямленчая) практыка студэнтаў праводзіцца ў IV семестры (36 гадзін) працягам дванаццаць тыдняў без адрыву ад аўдыторных заняткаў. *Мэта* практыкі – азнаямленне студэнтаў з умовамі работы рэжысёраў свят, жанравай разнастайнасцю мерапрыемстаў, якія праводзяцца ва ўстановах культуры і адукацыі, з этапамі арганізацыі мерапрыемстваў (планаванне, складанне арганізацыйнага плана, напісанне сцэнарыя і г.д.), правядзеннем рэпетыцыйнага працэсу і самога свята.

*Задачы* практыкі:

1) атрымаць пачатковыя веды па арганізацыі, правядзенні святочных мерапрыемстваў і набыць уменні аналізаваць іх арганізацыю і правядзенне ва ўмовах назірання за ходам творчага працэсу;

2) абагульніць асноўныя кірункі дзейнасці, выкарыстанне разнастайнасці жанраў пры планаванні і правядзенні святочных мерапрыемстваў ва ўстановах культуры ці ўстановах адукацыі ў галіне культуры;

3) прасачыць канцэпцыю ў арганізацыі і правядзенні святочных мерапрыемстваў гадавога цыкла ва ўстанове культуры ці ўстанове адукацыі;

4) прапанаваць схему арганізацыі і правядзення рэпетыцыйнага працэсу па ўвасабленні святочных мерапрыемстваў, сведкамі якіх былі студэнты на працягу азнаямленчай практыкі.

Практыка праходзіць пад кіраўніцтвам выкладчыка кафедры рэжысуры абрадаў і свят. Практыканты працуюць па калектыўным плане, які складае кіраўнік. Практыка прадугледжвае сустрэчы студэнтаў і кіраўніка практыкі з супрацоўнікамі базы практыкі па профілю спецыяльнасці. Кіраўнік ад базы практыкі мае права прадстаўляць па просьбе кіраўніка практыкі ад кафедры і студэнтаў дакументацыю праведзеных свят (планы культурна-масавых мерапрыемстваў на год, арганізацыйныя планы мерапрыемстваў, сцэнарыі, каштарысы свят, відэазапісы лепшых мерапрыемстаў). Студэнты разам з кіраўніком практыкі ад кафедры знаёмяцца з планам правядзення мерапрыемстваў на месяц, наведваюць па дамоўленасці з дырэктарам, мастацкім кіраўніком, рэжысёрам масавых свят ці культарганізатарам базы практыкі зводныя, тэхнічныя і генеральныя рэпетыцыі, прысутнічаюць на мерапрыемствах.

Базай практыкі з’яўляецца ўстанова культуры ці ўстанова адукацыі ў галіне культуры; яе дырэктар дае дазвол на ўдзел студэнтаў у якасці назіральнікаў за арганізацыяй і правядзеннем святочных мерапрыемстваў, гульнёва-забаўляльных праграм, тэматычных канцэртаў і інш.

Практыка складаецца са знаёмства з дакументацыяй па правядзенні культурна-масавых мерапрыемстваў, з наведван-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ня і назіранне за тэхналогіяй рэпетыцыйнага працэсу і якасцю ўвасаблення мастацкай задумы святочнага мерапрыемства.

Заканчваецца практыка дыферэнцыраваным залікам, на які студэнты прадстаўляюць дзённікі практыкі з дакладным разборам разнастайных жанраў святочных мерапрыемстваў адпаведна гадавому плану культурна-масавых мерапрыемстваў у пэўнай установе культуры ці ўстанове адукацыі ў галіне культуры, іх асноўных кірункаў дзейнасці па арганізацыі і правядзенні святочных мерапрыемстваў. Акрамя гэтага, кожны студэнт прадстаўляе графік наведванняў рэпетыцыйнага працэсу і святочных мерапрыемстваў. На канферэнцыі абагульняюцца вынікі азнаямленчай практыкі і робяцца прапановы па ўдасканаленні яе перспектыўных кірункаў.

У часе азнаямленчай практыкі студэнтам неабходна выканаць наступныя заданні, якія складаюць яе асноўны змест:

1) выявіць характэрныя кірункі культурна-дасугавай дзейнасці, разнастайнасць жанравых мерапрыемстваў на аснове азнаямлення з дакументацыяй па арганізацыі і правядзенні культурна-масавых мерапрыемстваў;

2) скласці графік наведвання рэпетыцый і разбору дзеянняў рэжысёра-пастаноўшчыка на рэпетыцыях па расстаноўцы сэнсавых акцэнтаў;

3) зрабіць аналіз святочных мерапрыемстваў, на якіх практыканты прысутнічалі як назіральнікі (дасягненні і недахопы пры ўвасабленні творчай задумы святочнага мерапрыемства; выкарыстанне ўдалых мізансцэн; водгукі гледачоў; цікавыя рэжысёрскія знаходкі і інш.);

4) азнаёміцца з традыцыямі правядзення народных свят;

5) сабраць звесткі аб дзейнасці фальклорных калектываў, іх рэпертуары.

*Заключная дакументацыя вучэбнай (азнаямленчай) практыкі.* Пасля заканчэння азнаямленчай практыкі студэнт-практыкант афармляе індывідуальны дзённік, які адлюстроўвае змест работы студэнта на практыцы, аналіз кірункаў культурна-масавай дзейнасці базавай установы, дакументацыю па арганізацыі і правядзенні святочных мерапрыемстваў. Пажадана ў дзённіку ўказаць графік наведвання рэпетыцый (падрабязна апісаць этапы рэпетыцый і расстаноўку рэжысёрам падчас іх правядзення сэнсавых акцэнтаў) і святочных мерапрыемстваў (прывесці абагульненне вынікаў рэ-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

петыцыйнай работы, на якой практыкант прысутнічаў як назіральнік).

Пасля падвядзення вынікаў дыферэнцыраванага заліку кіраўнік вучэбнай (азнаямленчай) практыкі ад кафедры падводзіць вынікі практыкі, характарызуе і ацэньвае работу студэнта.

Вынікі праходжання вучэбнай практыкі абмяркоўваюцца на пасяджэннях кафедры рэжысуры абрадаў і свят.

Метадычныя рэкамендацыі да праходжання практыкі прыведзены ў Інфармацыйна-метадычнай частцы праграмы.

## ЗМЕСТ ВЫТВОРЧАЙ (РЭЖЫСЁРСКАЙ) ПРАКТЫКІ

Вытворчая (рэжысёрская) практыка праводзіцца ў VI семестры (144 гадзіны) працягам восем тыдняў з вызваленнем ад аўдыторных заняткаў. *Мэта* практыкі – замацаванне тэарэтычных ведаў, набыццё пачатковых навыкаў арганізацыі і правядзення свята. Разам з тым вытворчая практыка з'яўляецца формай праверкі творчых здольнасцей студэнта, яго прафесійнай прыгоднасці.

Практыка праходзіць пад кіраўніцтвам выкладчыка кафедры рэжысуры абрадаў і свят. Практыканты працуюць па індывідуальным плане, які дае ім магчымасць усебакова праявіць творчы патэнцыял. Практыка прадугледжвае штодзённую работу студэнта на працягу шасці гадзін у адпаведнасці з планам, які зацвярджаецца кіраўніком ад базы практыкі і выкладчыкам кафедры рэжысуры абрадаў і свят.

Базай практыкі з'яўляецца ўстанова культуры ці ўстанова адукацыі; яе дырэктар дае дазвол на ўдзел студэнтаў у арганізацыі і правядзенні пэўнага свята, згодны прадаставіць творчае, матэрыяльна-тэхнічнае і фінансавае яго забеспячэнне.

Практыка складаецца з арганізацыі асобных святочных дзействаў згодна з распрацаваным студэнтам сцэнарыем, падрыхтаваных і ўвасобленых у базавай установе.

Заканчваецца практыка дыферэнцыраваным залікам, на які студэнты прадстаўляюць дзённікі практыкі, аналіз святочных дзействаў, у якіх яны бралі ўдзел, у якіх былі назіральнікамі, абагульняюць вынікі практыкі і робяць прапановы па ўдасканаленні яе перспектыўных кірункаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Задачы* практыкі ва ўмовах рэалізацыі пэўнага святочнага праекта:

1) замацаваць веды, уменні і навыкі распрацоўкі, арганізацыі і правядзення гульнёвых праграм, набытыя студэнтамі па дысцыпліне "Рэжысура свят (беларускія народныя гульні)" на I курсе;

2) увасобіць у пэўным святочным праекце абрадавыя дзействы, падрыхтаваныя ў мэтах вытворчай практыкі;

3) набыць пачатковыя навыкі асістэнцка-рэжысёрскай работы па ўвасабленні асобных фрагментаў рэжысёрскага эпізоду свята.

У часе рэжысёрскай практыкі студэнтам неабходна выканаць наступныя *заданні,* якія адлюстроўваюць яе змест:

1) скласці і ўвасобіць сцэнарна-рэжысёрскую распрацоўку абрадавых эпізодаў свята;

2) браць удзел у правядзенні гульнёвай праграмы ці асобнага мастацка-гульнёвага дзейства (аўкцыёна, латарэі, атракцыёна, забавы, гульні) у якасці выканаўцы. Пажадана выкарыстоўваць матэрыял, які быў распрацаваны на першым і другім курсах навучання. Ва ўмовах практыкі неабходна прыстасаваць яго да пэўнага свята з улікам асаблівасцей прасторавага рашэння і ўзроставага складу ўдзельнікаў;

3) распрацаваць і ўвасобіць абрадавыя і відовішчныя дзействы на аснове ведаў і ўменняў, набытых на II курсе;

4) выканаць функцыянальныя абавязкі асістэнта рэжысёра падчас падрыхтоўкі і пастаноўкі асобнага фрагмента рэжысёрскага эпізоду свята;

5) азнаёміцца з традыцыямі правядзення народных свят;

6) сабраць звесткі аб дзейнасці фальклорных калектываў, іх рэпертуары.

*Заключная дакументацыя вытворчай (рэжысёрскай) практыкі*. Пасля заканчэння практыкі студэнт афармляе сцэнарый мастацка-гульнёвага і абрадава-святочнага дзейства, у якім ён браў удзел падчас праходжання практыкі, прадстаўляе дзённік практыкі, які падпісаны кіраўнікамі практыкі (ад установы – базы практыкі і ад кафедры), і пісьмовую справаздачу аб выкананні заданняў практыкі.

Пасля падвядзення вынікаў дыферэнцыраванага заліку кіраўнік ад кафедры пісьмова аналізуе дзейнасць кожнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

практыканта і выстаўляе адзнаку за ўдзел у вытворчай (рэжысёрскай) практыцы.

Метадычныя рэкамендацыі змешчаны ў Інфармацыйна-метадычнай частцы праграмы.

## ЗМЕСТ ПЕДАГАГІЧНАЙ ПРАКТЫКІ

Педагагічная практыка студэнтаў кафедры рэжысуры абрадаў і свят праводзіцца на IV курсе ў VIII семестры (144 гадзіны) на працягу чатырох тыдняў (з адрывам ад вучэбных заняткаў). Практыка з'яўляецца падсумоўваннем навучання студэнтаў па псіхолага-педагагічных дысцыплінах, у яе часе набываюцца практычныя навыкі выкладання спецдысцыплін у галіне рэжысуры свят. Педагагічная практыка праводзіцца ў адпаведнасці з вучэбнай праграмай і Палажэннем аб педагагічнай практыцы студэнтаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Для ажыццяўлення педагагічнай практыкі вызначаюцца два кіраўнікі: адзін – ад кафедры рэжысуры абрадаў і свят, другі – ад кафедры псіхалогіі і педагогікі. Абодва кіраўнікі ў адпаведнасці з праграмай складаюць план праходжання практыкі, індывідуальныя заданні для студэнтаў. У абавязкі кіраўнікоў практыкі ўваходзіць кантроль за яе ходам, прыняцце дыферэнцыраванага заліку па практыцы, паведамленне яе вынікаў на пасяджэннях кафедраў.

Педагагічная практыка скіравана на засваенне студэнтамі педагагічных працэсаў і з'яў у навучальных установах, фарміраванне творчых здольнасцей і якасцей асобы будучага педагога. Базай практыкі з'яўляюцца этнашколы, сярэднія школы, гімназіі, каледжы мастацтваў і інш.

*Мэта* педагагічнай практыкі – авалоданне практычнымі навыкамі і ўменнямі, а таксама тэхналогіяй выкладання спецыяльных дысцыплін (асновы рэжысуры і майстэрства акцёра, рэжысура свят, сцэнарнае майстэрства, моўнае дзеянне ў свяце, музычнае рашэнне свята, абрадава-святочная дзейнасць, мастацка-дэкаратыўнае рашэнне свята і гісторыя свят).

*Задачы* педагагічнай практыкі:

1) паглыбленне і замацаванне тэарэтычных ведаў па дысцыплінах псіхолага-педагагічнага цыкла, выкладаемых ва

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўніверсітэце, іх ужыванне ў вырашэнні прыкладных педагагічных і творчых задач;

2) фарміраванне і развіццё практычных навыкаў выкладання дысцыплін спецыялізацыі;

3) апрабацыя разнастайных, у тым ліку інавацыйных, метадаў і сродкаў навучання, азнаямленне з перадавым педагагічным вопытам;

4) выкарыстанне методыкі падрыхтоўкі да ўрока і выкладання вучэбнага матэрыялу ў залежнасці ад узросту навучэнцаў (вызначэнне мэты і зместу ўрока, выбар метадаў і прыёмаў дзеля дасягнення мэты ўрока, складанне плана і канспекта ўрока, падбор і падрыхтоўка наглядных дапаможнікаў і тэхнічных сродкаў і г.д.);

5) засваенне навыкаў самастойнага вядзення індывідуальных заняткаў па спецдысцыплінах.

Знаёмства з арганізацыяй вучэбнай і выхаваўчай работы ў творчых калектывах, установах адукацыі ў галіне культуры і ўстановах культуры (ансамбль, хор, сярэдняя школа, гімназія, гурток і студыя па інтарэсах).

Да справаздачы па педагагічнай практыцы студэнты прыкладаюць індывідуальныя планы работы, якія адлюстроўваюць яе *змест*. У індывідуальны план могуць быць уключаны наступныя віды работ (планы для практычных *заданняў* змешчаны ў Інфармацыйна-метадычнай частцы праграмы):

– планаванне заняткаў розных тыпаў;

– распрацоўка плана канспекта ўрока;

– азнаямленне з методыкай ацэнкі і кантролю ведаў;

– распрацоўка і правядзенне пазакласнага мерапрыемства;

– правядзенне гутарак з вучнямі, вывучэнне асобы – прадстаўніка дадзенай узроставай групы (на прыкладзе аднаго з вучняў як аб’екта вывучэння) і складу творчага калектыву ўвогуле;

– напісанне псіхолага-педагагічнай характарыстыкі на асобнага вучня ці вучэбны (творчы) калектыў;

– падрыхтоўка пісьмовага псіхолага-педагагічнага аналізу індывідуальных і групавых заняткаў;

– падрыхтоўка, правядзенне і вызначэнне педагагічнай эфектыўнасці ўрокаў і выхаваўчых мерапрыемстваў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Работы павінны адпавядаць мэтам і задачам вучэбна-выхаваўчага працэсу і быць накіраваны на канкрэтныя ўмовы і магчымасці базы педагагічнай практыкі.

Падчас правядзення практыкі кожны студэнт абавязаны:

1) наведаць не менш чым дваццаць заняткаў па розных дысцыплінах, якія праводзяць выкладчыкі базавай установы (20 гадзін);

2) правесці кантрольны самастойны занятак з навучэнцамі па спецдысцыпліне (1 гадзіна);

3) прыняць удзел у арганізацыі, падрыхтоўцы і правядзенні свята, абрада, відовішча ў базавай установе (80 гадзін). Працягласць пазакласнага мерапрыемства – 2 гадзіны;

4) студэнту неабходна азнаёміцца з патэнцыяльнымі (творчымі і фінансавымі) магчымасцямі базы будучай пераддыпломнай практыкі наконт ажыццяўлення дыпломнай пастаноўкі свята.

У апошні тыдзень практыкі студэнты працягваюць вучэбную і выхаваўчую работу і афармляюць справаздачную дакументацыю. Змест і якасць афармлення дакументацыі ўлічваецца пры вывядзенні выніковай адзнакі за педагагічную практыку.

*Заключная дакументацыя педагагічнай практыкі.* Па заканчэнні практыкі на кафедры рэжысуры абрадаў і свят адбываецца дыферэнцыраваны залік (праводзіцца праз тыдзень пасля заканчэння практыкі), на які студэнт-практыкант прадстаўляе наступныя дакументы:

1) дзённік педагагічнай практыкі з указаннем відаў работ, планамі самастойна праведзеных урокаў за подпісамі выкладчыкаў базавай установы;

2) псіхолага-педагагічную характарыстыку вучня (удзельніка мастацкага калектыву) ці псіхолага-педагагічную характарыстыку дзіцячага мастацкага калектыву базы практыкі;

3) водгук адміністрацыі навучальнай установы ці ўстановы культуры на арганізаванае і праведзенае студэнтам пазакласнае мерапрыемства (дзесяць пасіўных урокаў і адзін адкрыты ўрок);

4) псіхолага-педагагічны аналіз урокаў па спецдысцыплінах, праведзеных і наведаных падчас педагагічнай практыкі;

5) характарыстыка на студэнта ад установы, дзе адбывалася педагагічная практыка, з ацэнкай якасці педагагічнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

падрыхтоўкі студэнта і адзнакай за педагагічную практыку за подпісам кіраўніка гэтай установы.

Пасля выступленняў студэнтаў з дакладамі па асноўных выніках педагагічнай практыкі і іх абмеркавання кіраўнікі практыкі ад двух кафедраў выстаўляюць адзнаку аб здачы дыферэнцыраванага заліку.

## ЗМЕСТ ПЕРАДДЫПЛОМНАЙ ПРАКТЫКІ

Пераддыпломная практыка студэнтаў V курса праводзіцца ў X семестры і працягваецца дзесяць тыдняў (360 гадзін) на базах практыкі, прапанаваных кафедрай рэжысуры абрадаў і свят і зацверджаных факультэтам традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва. Практыка з’яўляецца адным з галоўных этапаў у навучанні будучага рэжысёра свят.

*Мэта* пераддыпломнай практыкі – самастойная дыпломная пастаноўка святочнай дзеі. Падчас яе адбываецца праверка ведаў, атрыманых студэнтам па дысцыплінах спецыялізацыі, а таксама яго творчага патэнцыялу і прафесійнай прыгоднасці.

Пераддыпломная практыка з’яўляецца індывідуальнай і праводзіцца кожным студэнтам па асабістым плане, распрацаваным разам з кіраўніком практыкі ад кафедры рэжысуры абрадаў і свят і кіраўніком ад базы практыкі.

Заканчваецца практыка дыпломнай пастаноўкай свята.

Мэта пераддыпломнай практыкі прадугледжвае сістэму арганізацыйных мерапрыемстваў і творчых *задач:*

– сабраць мясцовы этнаграфічны, іканаграфічны, дакументальны і гістарычны матэрыял па зацверджанай тэме свята;

– азнаёміцца з ландшафтнымі і архітэктурнымі асаблівасцямі месца будучай святочнай дзеі;

– прагледзець рэпертуар мастацкіх, тэхнічных, спартыўных і іншых калектываў, якія будуць браць удзел у свяце;

– удакладніць сцэнарый дыпломнай пастаноўкі і рэжысёрскі праект свята; матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне, арганізацыйна-фінансавую дакументацыю свята і каштарысныя разлікі;

– каардынаваць дзеянні ўсіх груп і адказных асоб, якія будуць задзейнічаны ў падрыхтоўцы і правядзенні дыпломнага свята;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– наладзіць сувязі з прыхільнікамі народнага мастацтва з ліку творчых, адміністрацыйных работнікаў устаноў культуры ці ўстаноў адукацыі адпаведнага раёна з мэтай падтрымкі дзейнасці па падвышэнні ролі мастацкай спадчыны ў духоўным жыцці грамадства;

– зрабіць відэазапіс свята;

– пасля пастаноўкі дыпломнага свята атрымаць водгук аб ім, а таксама пратакол пасяджэння камісіі (у складзе трох чалавек) аб прыёме дыпломнага свята.

У ходзе пераддыпломнай практыкі студэнту належыць выканаць наступныя *заданні:*

1) удакладніць з мясцовым кіраўніцтвам горада, раёна тэрмін і месца пастаноўкі дыпломнага свята, якія былі вызначаны раней;

2) зацвердзіць у кіруючых і фінансавых установах усю каштарысна-фінансавую дакументацыю, неабходную для пачатку работы па падрыхтоўцы тэхнічнага і творчага забеспячэння будучай пастаноўкі;

3) узнавіць альбо наладзіць сувязі са спонсарамі альбо групай спонсараў свята;

4) зацвердзіць у мясцовым кіраўніцтве кандыдатуру дырэктара свята;

5) абмеркаваць з кіраўніцтвам і зацвердзіць рабочы і пастановачны планы;

6) зацвердзіць адміністрацыйна-творчую пастановачную групу свята;

7) правесці пасяджэнне групы падрыхтоўкі свята, зацвердзіць адказных асоб па ўсіх напрамках падрыхтоўчага перыяду і асноўныя тэрміны тэхнічнай і творчай гатоўнасці;

8) удакладніць тэрміны сумеснай работы з мастаком, гукарэжысёрам, балетмайстрам, хармайстрам і іншымі асноўнымі ўдзельнікамі пастановачнай групы;

9) зацвердзіць з кіраўнікамі ўсіх творчых груп графік рэпетыцый (уключна зводныя, генеральныя) і прыступіць да іх;

10) наладзіць рэгулярныя сустрэчы з кіраўнікамі мастацкіх, спартыўных, тэхнічных і іншых калектываў і аб’яднанняў, якія бяруць удзел у свяце;

11) уносіць карэктывы ў графікі рэпетыцый і тэрміны падрыхтоўкі тэхнічнага абсталявання (пры неабходнасці);

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

12) рэгулярна інфармаваць кіраўнікоў практыкі ад кафедры аб ходзе падрыхтоўкі дыпломнай пастаноўкі;

13) праводзіць пасяджэнне групы падрыхтоўкі свята з інфармаваннем прадстаўнікоў выканаўчай улады згодна з тэрмінамі, зацверджанымі ў рабочым плане;

14) вызначыць з кіраўніцтвам рэгіёна камісію ад базы практыкі;

15) пастаянна абмяркоўваць з кіраўнікамі практыкі выкананне ўсіх работ, уключаных у індывідуальны план практыканта.

*Заключная дакументацыя пераддыпломнай практыкі*. Пасля заканчэння пераддыпломнай практыкі студэнт-практыкант афармляе наступную дакументацыю:

1) сцэнарый і рэжысёрскі праект свята;

2) водгук аб праведзеным свяце і афіцыйнае заключэнне з адзнакай ад прыёмнай камісіі (форма вольная);

3) характарыстыка на студэнта-дыпломніка за час пераддыпломнай практыкі ад аддзела культуры і кіраўніцтва базавай установы;

4) пісьмовая справаздача аб асноўных этапах практыкі са сціслым прывядзеннем усіх заданняў (форма вольная).

5) копіі фінансава-каштарыснай дакументацыі з подпісамі і пячаткамі;

6) рабочы план, зацверджаны базавай установай;

7) друкаваная прадукцыя, фота-, відэаматэрыялы і іншая інфармацыя аб праведзеным свяце.

Метадычныя рэкамендацыі змешчаны ў Інфармацыйна-метадычнай частцы праграмы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. *Адукацыйны* стандарт Рэспублікі Беларусь. Вышэйшая адукацыя. Першая ступень. Спецыяльнасць – 1-17 01 05 Рэжысура свят (па напрамках).1-17 01 05-01 Рэжысура свят (народныя). Кваліфікацыя – Рэжысёр. Выкладчык; 1-17 01 05-02 Рэжысура свят (тэатралізаваныя). Кваліфікацыя – Рэжысёр. Выкладчык / Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. – Мінск, 2008. – 33 с.

2. *Аляхновіч, А.М.* Народная песня ў школе: дапаможнік / А.М. Аляхновіч. – Мінск: Беларусь, 2004. – 169 с.

3. *Аляхновіч, А.М.* Фальклор у выхаванні школьнікаў: дапаможнік / А.М. Аляхновіч. – Мінск: Чатыры чвэрці, 2007. – 200 с.

4. *Гуд, П.А.* Тэхналогія стварэння свята: вучэб. дапаможнік / П.А. Гуд; Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў. – 2-е выд., стэрэатып. – Мінск, 2008. – 222с.

5. *Гуд, П.А.* Мастацтва феерверкаў: (вогненна-светлавыя дзеі народаў сусвету) / П.А. Гуд. – Мінск: Мэджік Бук, 2007. – 99 с.

6. *Круглов, Ю.Г.* Фольклорная практика: [пособие] / Ю.Г. Круглов. – М.: Просвещение, 1979. – 94 с.

7. *Селиванов, Ф.М.* Студенческая фольклорная практика: учеб.-метод. пособие / Ф.М. Селиванов. – М.: Изд-во Моск. ун-та, 1982. – 68 с.

8. *Черняк, Ю.М.* Режиссура праздников и зрелищ: учеб. пособие / Ю.М. Черняк. – Минск: Тетрасистемс, 2004. – 221 с.

9. *Фядотаў, А.Г.* Свята беларускага пісьменства ў школе: дапаможнік / А.Г. Фядотаў. – Мінск: Беларусь, 2000. – 53 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Дадатковая*

1. *Багдановіч, А.Я.* Перажыткі старажытнага светаўспрымання ў беларусаў / А.Я. Багдановіч. – Мінск: Беларусь, 1995. – 187 с.

2. *Великорусс* в своих песнях, обрядах, обычаях, верованиях, сказках, легендах / Материалы собранные и приведенные в порядок П.В. Шейном. – СПб.: Тип. Императ. АН, 1898. – Т. 1., вып. 1. – 834 с.

3. *Венгер, Л.А.* Педагогика способностей / Л.А. Венгер. – М., 1973.

4. *Ветлугина, Н.А.* Основные проблемы художественного творчества детей / Н.А. Ветлугина. – М., 1985.

5. *Выготский, Л.С.* Воображение и творчество в детском возрасте: психол. очерк: кн. для учителя / Л.С. Выготский. – 3-е изд. – М.: Просвещение, 1991. – 93 с.

6. *Выготский, Л.С.* Вопросы детской психологии / Л.С. Выготский. – СПб.: СОЮЗ, 1997. – 224 с.

7. *Грамадскі* быт і культура сельскага насельніцтва Беларусі / В.А. Бандарчык [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 223 с.

8. *Давыдов, В.В.* Теория развивающего обучения / В.В. Давыдов. – М., 1996. – 465 с.

9. *Дзіцячы* фальклор: зб. фальклор. матэрыялаў / рэдкал.: У.А. Васілевіч (навук. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БДПУ, 2006. – 259 с. – (Фальклор Беларусі. XX–XXI).

10. *Земляробчы* каляндар / рэд. А.Ю. Лозка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1990. – 564 с.

11. *Казакова, І.В.* Беларускі фальклор: вучэб. дапаможнік / І.В. Казакова. – Мінск: Выд. цэнтр БДУ, 2007. – 309 с.

12. *Медведева, И.Я.* Разноцветные белые вороны / И.Я. Медведева, Т.Л. Шишова. – М.: Семья и школа, 1996. – 269 с.

13. *Мид, Маргарет.* Культура и мир детства / Маргарет Мид. – М., 1988.

14. *Одаренные* дети: пер. с англ. / общ. ред. Г.В. Бурлинской и В.М. Слуцкого; предисл. В.М. Слуцкого. – М.: Прогресс, 1991. – 376с.

15. *Психология* одаренности детей и подростков / под ред. Н.С. Лейтес. – М., 1996.

16. *Станиславский, К.С.* Собр. соч.: в 8 т. Т. 3. Работа актера над собой. Ч. 2. Работа актера над собой в творческом процессе перевоплощения. Дневник ученика / К.С. Станиславский; редкол.: М.И. Кедров (гл.ред.) [и др.]; Гос. науч.-исслед. институт театра и музыки; Моск. художеств. акад. театр им. М. Горького. – М.: Искусство, 1955. – 502 с.

17. *Традыцыйная* мастацкая культура беларусаў: у 6 т. Т. 1. Магілёўскае Падняроўе / Т.Б. Варфаламеева, В.І. Басько, М.А. Козенка [і інш.]. – Мінск: Беларус. навука, 2001. – 797 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*18. Традыцыйная* мастацкая культура беларусаў: у 6 т. Т. 2. Віцебскае Падзвінне / В.І. Басько [і інш.]; ідэя і агул. рэд. Т.Б. Варфаламеевай. – Мінск: Выш. шк., 2008. – 559 с.

*19. Традыцыйная* мастацкая культура беларусаў: у 6 т. Т. 3. Гродзенскае Панямонне: у 2 кн. Кн. 1 / В.І. Басько [і інш.]; аўт. ідэі Т.Б. Варфаламеева; агул. рэд. Т.Б. Варфаламеевай. – Мінск: Выш. шк., 2006. – 608 с.

*20. Традыцыйная* мастацкая культура беларусаў: у 6 т. Т. 3. Гродзенскае Панямонне: у 2 кн. Кн. 2 / А.М. Боганева [і інш.]; аўт. ідэі Т.Б. Варфаламеева; агул. рэд. Т.Б. Варфаламеевай. – Мінск: Выш. шк., 2006. – 736 с.

*21. Традыцыйная* мастацкая культура беларусаў: у 6 т. Т. 4. Брэсцкае Палессе: у 2 кн. Кн. 1 / В.І. Басько [і інш.]; ідэя і агул. рэд. Т.Б. Варфаламеевай. – Мінск: Выш. шк., 2008. – 559 с.

*22. Традыцыйная* мастацкая культура беларусаў: у 6 т. Т. 4. Брэсцкае Палессе: у 2 кн. Кн. 2 / В.І. Басько [і інш.]; ідэя і агул. рэдагаванне Т.Б. Варфаламеевай. – Мінск: Выш. шк., 2008. – 559 с.

*23. Фалькларыстыка* // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: у 5 т. Т. 5. Скамарохі – Яшчур / рэдкал.: І.П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелСЭ, 1987. – С. 381–383.

*24. Фальклор* у запісах Яна Чачота і братоў Тышкевічаў / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы; уклад., сістэматызацыя тэкстаў і камент. В.І. Скідана, А.М. Хрушчовай; уступ. арт. Т.В. Валодзінай; навук. рэд. А.С. Ліс. – 2-е выд. – Мінск: Беларус. навука, 2005. – 330 с. – (БНТ: Беларуская народная творчасць).

*25. Чурилова, Э.Г.* Методика и организация театрализованной деятельности дошкольников и младших школьников: программа и репертуар / Э.Г. Чурилова. – М.: ВЛАДОС, 2001. – 160 с. – (Театр и дети).

*26. Шаповаленко, И.В.* Возрастная психология (Психология развития и возрастная психология) / И.В. Шаповаленко. – М.: Гардарики, 2004. – 349 с.

*27. Шейн, П.В.* Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. Т. 1–2. Бытовая и семейная жизнь белоруса в обрядах и песнях. – СПб.: Тип. Императ. АН, 1890. – 715 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

28. *Шейн, П.В.* Сборник народных детских песен, игр и загадок / П.В. Шейн; сост. А.Е. Грузинский. – М.: Тов-во тип. Мамонтова, 1898. – 81 с.

## Метадычныя рэкамендацыі да праходжання вучэбнай (азнаямленчай) практыкі

1. На базу практыкі студэнты прыбываюць разам з кіраўніком, знаёмяцца з базавай установай, вылучаюць культурна-масавыя мерапрыемствы па жанрах, абагульняюць па напрамках работу культурна-масавага аддзела і дакументацыю святочных мерапрыемстваў, якія былі праведзены на працягу года базавай установай культуры ці ўстановай адукацыі.
2. Пры сустрэчы практыкантаў з адміністрацыяй базавай установы канчаткова і дэталёва ўдакладняюцца розныя аспекты ўдзелу студэнтаў у наведваннях рэпетыцый і святочных мерапрыемстваў дадзенай установы.
3. Студэнты дэталёва знаёмяцца з работай і рэпертуарам творчых калектываў дадзенай установы культуры ці ўстановы адукацыі.
4. Пажадана загадзя прасіць дазволу аб наведванні практыкантамі рэпетыцый у якасці назіральнікаў непасрэдна ў рэжысёра-пастаноўшчыка пэўнага мерапрыемства.
5. Па завяршэнні свята практыканты праводзяць сярод гледачоў экспрэс-апытанне аб уражаннях ад убачанага, а таксама робяць уласны аналіз свята, дзе аналізуюць дасягненні і недахопы пастаноўкі святочнага мерапрыемства, цікавыя рэжысёрскія знаходкі, выкарыстанне ўдалых мізансцэн, водгукі гледачоў і інш.
6. Кожны студэнт-практыкант пастаянна павінен аналізаваць правядзенне рэпетыцый у базавай установе, абагульняць вынікі творчай, арганізацыйнай работы пастаноўшчыкаў святочных мерапрыемстваў і выказваць прапановы па іх ўдасканаленні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Метадычныя рэкамендацыі да праходжання вытворчай (рэжысёрскай) практыкі

1. На базу рэжысёрскай практыкі студэнты прыбываюць з літаратурнай распрацоўкай абрадавых і гульнёвых дзей – эпізодаў свята; да распрацоўкі пажадана прыкласці план творчага і матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння.

2. Пры сустрэчы з адміністрацыяй базавай установы канчаткова і дэталёва ўдакладняюцца розныя аспекты ўдзелу практыкантаў у свяце.

3. Студэнты сумесна з кіраўнікам практыкі бяруць удзел у абмеркаванні рэжысёрамі-пастаноўшчыкамі асобных эпізодаў свята на месцы правядзення свята, на натуры, прынцыпаў прасторавага рашэння дзейства, плана размяшчэння зон і пунктаў, дзе яны будуць увасабляць творчыя распрацоўкі. Практыканты высвятляюць спосабы сувязі з рэжысёрамі-пастаноўшчыкамі (па радыё, перагаворных прыладах, знакавай сістэме рознакаляровых сцяжкоў або пры дапамозе пасыльных).

4. Пры падрыхтоўцы асобных гульнёвых дзействаў (аўкцыёнаў, латарэй, атракцыёнаў, забаў конкурснага характару) студэнтам неабходна арганізаваць сустрэчы, рэкламныя кампаніі для той катэгорыі насельніцтва, для якой плануецца правядзенне свята. Студэнты тлумачаць людзям умовы правядзення свята, заахвочваюць для стварэння актыву ўдзельнікаў, якія б на свяце маглі распачаць забаву.

5. За дзень да свята студэнты-культарганізатары пад распіску атрымліваюць прызы, а пасля правядзення свята разам з рэжысёрам зоны дзеяння і бухгалтарам свята складаюць і падпісваюць акт аб спісанні рэалізаваных прызоў.

6. Пры выкананні асістэнцка-рэжысёрскіх абавязкаў падчас правядзення рэпетыцый студэнты павінны дакладна запісваць усе заданні рэжысёра, што дапаможа правільна выканаць іх у час свята і пазбегнуць непаразуменняў.

7. Пасля правядзення свята неабходна правесці сярод гледачоў экспрэс-апытанне аб іх уражаннях, пачуццях ад убачанага, а таксама зрабіць асабісты аналіз свята, дзе будуць прысутнічаць вынікі і прапановы.

8. Практыкант штодзённа павінен занатоўваць усе аспекты сваёй работы, рабіць аналіз правядзення рэпетыцый, абагульняць вынікі і выказваць прапановы па ўдасканаленні рабочых сітуацый.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# Планы для практычных заданняў да педагагічнай практыкі

## ПЛАН ПСІХОЛАГА-ПЕДАГАГІЧНАЙ ХАРАКТАРЫСТЫКІ ВУЧЭБНА-ТВОРЧАГА КАЛЕКТЫВУ

1. Агульныя звесткі пра калектыў і гісторыю яго стварэння.

Колькасць удзельнікаў, у тым ліку мужчын і жанчын, узроставы склад, калі сфарміраваўся калектыў, ці мяняліся кіраўнікі і г.д.

2. Кіраўніцтва і арганізацыя творчага калектыву.

Ядро, якое яднае калектыў, яго актыў, кіраўнік (староста) і яго работа; характарыстыка актывістаў (ініцыятыўнасць, самастойнасць, патрабавальнасць да сябе і іншых, аўтарытэт у калектыве, арганізатарскія здольнасці).

3. Узаемаадносіны ўнутры калектыву.

Характар дзелавых і міжасобасных адносін, ступень згуртаванасці.

4. Характарыстыка вучэбна-творчай дзейнасці калектыву.

Паспяховасць у засваенні рэпертуару (рашэнне мастацка-творчых задач). Колькасць пасіўных удзельнікаў і іх невысокі ўзровень падрыхтоўкі; прычыны гэтага. Работа калектыву над рэпертуарам – наяўнасць кантролю, патрабаванні з боку кіраўніка, актыву, узаемадапамога, яе формы і арганізацыя. Наяўнасць адмоўных момантаў у вучэбна-творчай дзейнасці. Адносіны ўдзельнікаў калектыву да выпадкаў невыканання патрабаванняў кіраўніка. Салісты і канцэртмайстры (найбольш таленавітыя ўдзельнікі) у калектыве, ступень іх уплыву на калектыў.

5. Стан дысцыпліны ў калектыве.

Дысцыпліна на рэпетыцыях (занятках) і на канцэрце (творчым паказе). Прычыны дрэннай дысцыпліны. Меры, якімі падтрымліваецца дысцыпліна на рэпетыцыях. Уплыў асобных удзельнікаў на стан дысцыпліны. Асноўныя метады барацьбы з парушальнікамі дысцыпліны. Стаўленне кіраўніка калектыву да выпадкаў парушэння дысцыпліны.

6. Узаемаадносіны калектыву з кіраўніком.

Роля кіраўніка ў калектыве. Стыль і метады работы. Стаўленне калектыву да свайго кіраўніка, яго аўтарытэт сярод артыстаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

7. Жыццё калектыву па-за рэпетыцыямі і канцэртамі.

Цікаўнасць да сучасных падзей мастацтва, літаратуры і спорту, формы праяўлення. Удзел калектыву ў жыцці культурна-асветнай (навучальнай) установы.

8. Грамадская і дабрачынная дзейнасць калектыву.

9. Псіхолага-педагагічныя вывады, прапановы.

У тым ліку мерапрыемствы, якія спрыяюць умацаванню міжасобасных адносін у калектыве.

### ПЛАН ПСІХОЛАГА-ПЕДАГАГІЧНАЙ ХАРАКТАРЫСТЫКІ ВУЧНЯ (УДЗЕЛЬНІКА ТВОРЧАГА КАЛЕКТЫВУ)

1. Сацыяльна-дэмаграфічныя дадзеныя: прозвішча, імя, імя па бацьку; горад, навучальная ўстанова (творчы калектыў), узрост, клас (год навучання, стаж), сацыяльнае паходжанне, звесткі пра бацькоў, іх адносіны да выхавання дзяцей, іншае (нацыянальнасць, месца і ўмовы пражывання).

2. Стан здароўя: наяўнасць фізічных недахопаў, хранічных хвароб, магчымасць займацца пэўным відам мастацкай творчасці па стане здароўя і агульным фізічным развіцці.

3. Паспяховасць у мастацкім калектыве і навучальнай установе (агульнаадукацыйнай школе, школе мастацтваў, студыі і г.д.).

4. Хобі, захапленні.

5. Тэмперамент. Структура характару: адносіны да вучобы, выкладчыка (мастацкага кіраўніка), аднакласнікаў, да бацькоў, да працы (у калектыве, навучальнай установе, дома), да выканання грамадскіх даручэнняў.

6. Узровень развіцця псіхалагічных якасцей – увагі, успрымання, памяці, мыслення, уяўлення.

7. Узровень развіцця спецыяльных (мастацкіх) здольнасцей – эмацыянальнай чуласці, слыху, рытму, памяці, мыслення, успрымання, уяўлення, маторных здольнасцей і інш.

8. Узровень развіцця мовы.

9. Эмацыянальна-валявыя ўласцівасці: эмацыянальная ўстойлівасць, мэтанакіраванасць, настойлівасць, арганізаванасць і інш.

10. Тыповыя маральныя якасці: адказнасць, самастойнасць, добрасумленнасць, калектывізм, дысцыплінаванасць, павага да іншых, таварыскасць, працавітасць.

11. Вывады: паказаць, якія індывідуальна-псіхалагічныя ўласцівасці навучэнца трэба ўлічваць пры арганізацыі вучэбна-выхаваўчай работы з ім.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Схема самааналізу адкрытага ўрока па спецдысцыпліне

### *I. Уводзіны да ўрока*

1. Стварэнне псіхалагічнага настрою.
2. Пастаноўка мэты.
3. Фарміраванне матываў навучання.

### *II. Забеспячэнне на ўроку*

1. Дыдактычны матэрыял і тэхнічныя сродкі.
2. Мэтазгоднасць іх выкарыстання.

### *III. Змест урока*

1. Адпаведнасць метадычнай структуры ўрока яго мэтам.
2. Даступнасць выкладання вучэбнага матэрыялу.
3. Дыферэнцыяцыя вучэбных заданняў.
4. Навуковасць зместу.
5. Арганізацыя і выкарыстанне міждысцыплінарных сувязей.
6. Маральная і светапоглядная накіраванасць урока.
7. Эстэтычнае ўздзеянне ўрока на вучняў.
8. Выкарыстанне эфектыўных метадаў навучання, іх варыятыўнасць.
9. Варыятыўнасць і эфектыўнасць формаў кантролю вучэбнай дзейнасці.
10. Актывізацыя цікавасці да прадмета, прымяненне гульнёвых метадаў.

### *IV. Псіхалагічныя аспекты ўрока*

1. Змена відаў дзейнасці на ўроку.
2. Выкарыстанне розных відаў памяці (вобразная, слоўналагічная, рухальная, эмацыянальная, зрокавая).

### *V. Ацэнка дзейнасці навучэнцаў*

1. Ступень актыўнасці.
2. Арганізаванасць і дысцыпліна.
3. Моўнае развіццё, уменне лагічна мысліць, аргументавана выкладаць свае думкі.
4. Развіццё харэаграфічных уменняў і навыкаў.

### *VI. Ахова працы на ўроку*

1. Падрыхтаванасць памяшкання (асвятленне, чысціня, стан паветра).
2. Назіранне за паставай навучэнцаў.
3. Наяўнасць дынамічнай паўзы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *VII. Узаемадзеянне вучняў і настаўніка*

1. Узровень педагагічнага майстэрства, культура, такт, знешні выгляд, мова выкладчыка.
2. Наяўнасць зваротнай сувязі.
3. Забеспячэнне спрыяльнага псіхалагічнага клімату.

### *VIII Вынікі ўрока*

1. Выкананне намечанага плана, ступень дасягнення мэты.
2. Выкарыстанне выхаваўчых магчымасцей адзнакі.

## Схема агульнапедагагічнага аналізу ўрока па спецдысцыпліне

1. Месца дадзенага ўрока ў сістэме ўрокаў па дысцыпліне, правільнасць пастаноўкі мэты ўрока.

2. Арганізацыя ўрока:

а) тып урока;

б) структура урока; яго элементы, іх паслядоўнасць і дазіроўка ў часе; адпаведнасць будовы ўрока яго зместу і пастаўленай мэце;

в) падрыхтаванасць калектыву да ўрока;

г) арганізацыя актыўнай работы на працягу ўсяго ўрока; спалучэнне групавой і калектыўнай работы на ўроку;

д) насычанасць урока; рацыянальнае выкарыстанне часу.

3. Змест урока:

а) навуковасць і даступнасць вучэбнага матэрыялу;

б) правільнасць падбору матэрыялу для розных этапаў урока і відаў дзейнасці навучэнцаў;

в) адпаведнасць зместу ўрока патрабаванням праграмы;

г) выхаваўчая накіраванасць урока;

д) сувязь тэорыі з практыкай; раскрыццё выкладчыкам практычнага значэння ведаў; выкарыстанне ведаў на практыцы;

е) сувязь вывучаемага матэрыялу з папярэднімі ведамі; прыёмы паўтарэння;

ж) міждысцыплінарныя сувязі;

з) мова выкладчыка: арфаэпічная правільнасць, эмацыянальнасць, лексічнае багацце;

і) якасць ведаў, уменняў і навыкаў вучняў;

к) мова вучняў.

4. Методыка правядзення ўрока:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

а) забеспячэнне і выкарыстанне дыдактычнага матэрыялу на ўсіх этапах урока;

б) метады і прыёмы прыцягнення ўвагі навучэнцаў на кожным этапе ўрока;

в) адпаведнасць метадаў зместу і мэтам урока, узросту і ўзроўню падрыхтоўкі вучняў; эфектыўнасць выкарыстаных метадаў;

г) пастаноўка выкладчыкам перад вучнямі мэты ўрока і падвядзенне вынікаў;

д) валоданне выкладчыкам метадамі актыўнага навучання; мэтазгоднасць выкарыстання гэтых метадаў на ўроку;

е) сістэма ацэнкі ведаў.

5. Зносіны на ўроку: тон, стыль, манера зносін з вучнямі.

6. Работа і паводзіны вучняў на ўроку:

а) актыўнасць;

б) цікавасць да матэрыялу ўрока;

в) адносіны да выкладчыка;

г) дысцыплінаванасць і арганізаванасць.

7. Агульныя вывады ўрока. Улік вопыту, атрыманага на ўроку, у далейшай рабоце.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Метадычныя рэкамендацыі да праходжання пераддыпломнай практыкі

1. Па прыбыцці на базу пераддыпломнай практыкі першачаргова практыкант сустракаецца з кіраўніком базавай установы; узнаўляюцца ўсе творчыя і адміністрацыйныя сувязі.

2. Вызначаецца, па дамоўленасці з адміністрацыяй базавай установы, кіраўнік практыкі па месцы яе праходжання.

3. Разам з кіраўнікамі пераддыпломнай практыкі (ад універсітэта і ад базавай установы) ладзяцца кантакты з адміністрацыяй горада, раёна (у залежнасці ад месца правядзення дыпломнага свята) з мэтай удакладніць усе акалічнасці будучай работы.

4. Высвятляюцца магчымасці па падрыхтоўцы друкаванай прадукцыі (афішы, праграмы, запрашэнні і г.д.) і яе выпуску ў свет.

5. У час падрыхтоўчага перыяду кіраўнік практыкі ад універсітэта выязджае (не менш, чым тры разы) на месца правядзення свята і аказвае неабходную практычную дапамогу.

6. На прыём дыпломнай работы выязджае камісія, зацверджаная на пасяджэнні кафедры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# З М Е С Т

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА ……………………………………..... 3
ЗМЕСТ ВУЧЭБНАЙ (АЗНАЯМЛЕНЧАЙ) ПРАКТЫКІ …............ 7
ЗМЕСТ ВЫТВОРЧАЙ (РЭЖЫСЁРСКАЙ) ПРАКТЫКІ ………… 10
ЗМЕСТ ПЕДАГАГІЧНАЙ ПРАКТЫКІ ……………………....... 12
ЗМЕСТ ПЕРАДДЫПЛОМНАЙ ПРАКТЫКІ …………………….. 15
ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА ……………….. 18
Літаратура ………………………………………………… 18
Метадычныя рэкамендацыі да праходжання вучэбнай (азнаямленчай) практыкі ……………………………………… 21
Метадычныя рэкамендацыі да праходжання вытворчай (рэжысёрскай) практыкі ……………………………... 22
Планы для практычных заданняў да педагагічнай практыкі ………………………………………………………… 23
Схема самааналізу адкрытага ўрока па спецдысцыпліне ……………………………………………………... 25
Схема агульнапедагагічнага аналізу ўрока па спецдысцыпліне ………………………………………………….. 26
Метадычныя рэкамендацыі да праходжання пераддыпломнай практыки ………………………………………… 28

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ПРАГРАМА ВУЧЭБНАЙ І ВЫТВОРЧАЙ ПРАКТЫКІ СТУДЭНТАЎ**

*па спецыяльнасці 1-17 01 05 Рэжысура свят (па напрамках) напрамку спецыяльнасці 1-17 01 05-01 Рэжысура свят (народныя)*

Рэдактар В. В. Каташвілі
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2011 г. Фармат 60х84$^{1}/_{16}$.
Папера пісчая № 2. Ум. друк. арк. 1,74. Ул.-выд. арк. 1,18.
Тыраж экз. Заказ .

УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.
Ліцэнзія № 02330/0003939 ад 19.05.2011 г.

Надрукавана на рызографе
УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ